Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana gotoŭkaj

№ 1 Вільня, Субота 10 Студзеня 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

13228

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	Цана абвестак: на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай — 40 грш. - за радок дробнага друку ў аднэй шпальцэ

На парозе Новага Году.

Мінуў стары год. Належа ён да тых гадоў, у якія многія дзяржавы і народы залечваюць пасьляваенныя раны і ўпорыста працуюць у кірунку наладжаньня нармальнага жыцьця. Але раны гэныя занадта глыбокія і аздараўленьне іх ідзе паволі, з трудом паступае ўперад, а часта і цалкам астаецца на мейсцы.

У жыцьці эканамічным Эўропы і Амэрыкі мінулы год азначыўся цяжкой хваробай — безрабоцьцем мільёнаў людзей. З гэтай страшнай хваробай упорыста змагаліся ў мінулым годзе выдатныя эканамісты і палітыкі, з гэтай-жа самай хваробай прыдзецца ім так-жа змагацца і ў гэтым новым годзе. Змаганьне гэта аднак цяжкое і вынікі яго схаваны ад людзей у нейкай таёмнай няпэўнасьці і няясвасьці.

У жыцьці палітычным на арэне міжнароднай у мінулым годзе найбольш была жывой справа перагляду Вэрсальскага Трактату, ці прасьцей кажучы, справа перагляду граніц польска-нямецкіх, аб чым у мінулым годзе голасна загаварыў народ нямецкі. Справа гэта нязвычайнай палітычнай важнасьці для многіх дзяржаў і народаў Эўропы. Пад знакам гэтай-жа справы ў міжнароднай палітыцы пачынаецца і гэты год новы.

Для адраджэнскага жыцьця беларускага мінулы год быў так-жа асабліўшым — у ім наступіў вялікі заняпад нашага адраджэньня.

Бачым гэты заняпад у Беларусі пад Польшчай, дзе мы ня маем магчымасьці разьвіваць ані сваей культуры, ані эканомікі.

Бачым гэты заняпад і ў Савецкай Беларусі, дзе ў мінулым годзе камуністы даканалі поўнага разгрому беларускай культуры і беларускай эканомікі.

Словам, стары год перадаў новаму году ў спадчыне як для многіх іншых народаў, так і для нас Беларусаў многа заданьняў, многа цяжкіх бед, з якімі прыдзецца ў новым годзе ўпорыста і цяжка змагацца.

Новы год — гэта пятнаццаты год выдавецтва нашай часопісі і нашай публічнай працы культурнай, грамадзкай і палітычнай.

У ліку чатырнаццаці гадоў бачылі мы гады рожныя: лепшыя і горшыя. Горшых, здаецца нам, было больш. Аднак гэта ўсё нас не зламала і ня зьбіла з пуцьця. На працягу чатырнаццаці гадоў нашай працы на нашых вачох у беларускім жыцьці тварыліся рожныя, часта дужа грозныя, бо безадказныя і рукой варожай кіраваныя, палітычныя пачынаньні і кірункі, але яны, ня маючы правільнай палітычнай ідэолёгіі, больш ці менш зашкодзіўшы народу, гінулі так хутка, як хутка паўставалі.

Адны мы праз чатырнаццаць гадоў працы нашай цьвёрда трымаліся аднэй і той самай, раз выбранай, ідэолёгічнай дарогі, верна нясучы ў руках сваіх наш беларускі народны бел-чырвона-белы сьцяг.

Вось-жа і ў новым годзе, які пачынаецца так жорстка як і для іншых народаў, так і для нас Беларусаў, моцна верым, што ўтрымаем гэны наш сьцяг, пад знакам якога далей будзем будзіць наш народ да самастойнага, шчасьлівага жыцьця...

240251

З газэт.

Пане Тэстіс, асьцярожна!

У зьвязку з ведамай Каляднай прамовай Рымскага Папы, поўурадовы „Kur. Wil.“ ў № 299 з мін. г. зьмясьціў даволі цікавую перадавіцу свайго палітычнага рэдактара п. Тэстіса пад загалоўкам „Ostrzeżenia papieskie“, у якой між іншым піша:

„...Забясьпечаньне супакою месьцiца ў пытаньні (zagadnieniu) забясьпечаньня натуральных правоў розьвітку кожнага народу, каторы хоча стацца сабой і ў змаганьні за гэтыя правы гатоў несьці найбольшыя ахвяры.

„Дзяржава ня ёсьць уласнасьцяй аднаго народу, хоць-бы ён тварыў у ей большасьць. Дзяржава, каторая ня хоча вайны, павінна ў сваіх рамах рэалізаваць натуральныя правы ўсіх нацыянальнасьцяў у ей жывучых...“

Пане Тэстіс! Беларусы гэта самае думаюць і кажуць не ад учора і ведаюць, што за такія думкі можна папасьціся ў няміласьць „сільных гэтага сьвету.“ Можа гэта спаткаць і Вас; асабліва-ж тады, калі-б Вы — уразрэз з традыцыйнай тактыкай большасьці польскага грамадзянства—не захацелі агранічыцца толькі пекнымі славамі.

Пажывём, пачуем...

А можа-б так без карнавалу?

Украінскі тыднёвік „Неділя“, у № 51-ым з мін. году, падае пад павыжшым загалоўкам перадавіцу, у якой між іншым кажа:

„...Усе мы, а ў першую чаргу маладыя і здаровыя, маемо права на жыцьцё і на яговыя радасьці і на ўсьмехі. Але... Ці застанавіўся хто з Украінцаў, што шумна-бунчучны мясаед, што гучны карнавал у ўмовах, сярод якіх нам даводзіцца жыць, гэта штось больш, чымся бязглузьдзе?

...У умовах, сярод якіх мы жывем, няма мейсца для карнаваловых вакханаліяў (развыдрэньня)! Ня вольна нам апускаць галоў, ня вольна таміцца пачуцьцём зьнявераньня й адчаю, мусімо проста й сьмела глядзець у твар усім злыбедам, але разам з тым няма і падстаў аж да такой радасьці і бязжурлівасьці, каб вырашаць іх у цэлым радзе забаваў вечарынак, і балёў... акропленых парфумай і алькаголем. На гэта мы ня толькі за ўбогія, на гэта мы за паважныя! Падумаймо толькі, што скажуць аб нас нашы дзеці—ўнукі, калі даведаюцца, што мы ў такі час гулялі, што мы ня мелі нічога лепшага да работы, ніякіх больш турботаў, як лякеры, ці сукенкі, ніякіх паважнейшых выдаткаў, як на балёвую бутафорыю. Бавіцца? Чаму не? Хай наша моладзь пойдзе па вясковых і падмейскіх чытальнях і народных дамох, хай там арганізуе забавы для народу і хай сама прымае там живое ўчасьце, але ў сталічных салях нашага краю мусяць пагаснуць балёвыя сьвяцільні і змоўкнуць фанфары балёвых аркестраў.

Далёкія ад нацыянальнай жалобы, мы асьмеліваемся кінуць кліч нацыянальнай павагі і самапавагі.“

На нашы беларускія варункі жыцьця да прыведзеных пажаданьняў шмат дадаць нельга! —н.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Звальненьне з вастрогу. У мінулым тыдні звольнены з вастрогу часьць сябраў Цэнтр. Управы Т-ва Бел. Школы. У ліку звольненых знаходзяцца грамадзяне: Г. Шырма і С. Паўловіч. Другая-ж часьць, у тым ліку старшыня Т-ва Стэцкевіч і Др. Марцінчык яшчэ знаходзяцца ў вастрозе.

Марыя Булыга, вучыцелька Шаўлянскай Беларускай Школы, паважна захварэла і знаходзіцца ў шпіталі ў Браславе.

„Народны Звон“ перастаў выходзіць. Цікава адзначыць, што беларуска-полёнофільскія газэты перастаюць звычайна выходзіць тады, калі зробяць „сваю работу“. „Наперад“ выходзіў тады, калі трэба было ліквідаваць астаткі „Грамады“ і лавіць у полёнофільскі лагер грамадаўскіх разьбіткаў. „Народны Звон“ выходзіў тады, калі трэба было разьбіваць беларускія народныя сілы падчас апошніх выбараў у польскі Сойм. Кожны раз раб зрабіўшы сваё мусіў адыйсьці на бок.

„Беларускі Звон.“ Пасьля „Народнага Звону“ пачала выходзіць у Вільні газэта „Беларускі Звон“. Адносна кірунку гэтай газэціны напішам другім разам.

Суд над рэдактарам „Бел. Крыніцы“. 13 г. м. Акружны Суд будзе судзіць рэдактара Я. Пазьняка за зьмяшчэньне ў № 21 з 1930 г. (сканфіскаваны) стацьці пад загалоўкам „Беларускае полёнофільства“. Пракуратура аскаржае Пазьняка па 132 арт. к. к.

Беларускі Студэнскі Саюз у Вільні ня змог паслаць на зьезд АБСА. свайго прадстаўніка з прычыны спазьненьня дазволу польскага ўраду на выезд прадстаўніка заграніцу, дзе адбываўся зьезд.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Паўстаньне сялян у Менскім вокрузе. Польскія газэты падаюць, што сяляне ў Менскім вокрузе паўсталі проціў камуністычнай ўлады з аружжам у руках. Паўстанцы сяляне азброены ў кулямёты. Паўстанцы арганізаваны па сто, пяцьдзесят і дваццаць пяць чалавек. Бальшавіком вылавіць паўстанцаў і змагацца з імі вельмі трудна, бо прыхільна да паўстанцаў вёска перахоўвае іх. Проціў паўстанцаў змагаюцца спэцыяльныя аддзелы бальшавіцкага войска.

Тыя-ж газэты падаюць, што паўстанцы ў працягу двух тыдняў даканалі больш 100 нападаў на камуністычныя інстытуцыі: — на невялікія аддзелы войска, на пошты і камуністычныя касы. Забілі 15 камуністаў і 10 жаўнераў. Бальшавікі да 15.XII.1930 г. расстралялі 75 паўстанцаў і 260 саслалі ў ссылку ў Сібір на катаржныя работы.

Каляды ў Радавай Беларусі. Не зважаючы на прасьледаваньне рэлігіі з боку камуністаў, насяленьне Радавай Беларусі абходзіла Каляды па хрысьціянску.

У гарадох і мястэчках, дзе цэрквы і касьцёлы яшчэ не закрыты, былі адпраўлены ўрачыстыя набажэнствы пры ўчасьці вялікіх натоўпаў людзей.

Па вёсках, дзе пазакрываны сьвятыні, былі адпраўлены набажэнствы ў хатах і гумнах, дзе жыхарства так-жа ў вялікім ліку прыймала ўчасьце ў набажэнствах.

У часе сьвята саюз бязбожнікаў вёў сільную проціўрэлігійную агітацыю, ладзіў проціўрэлігійныя паходы і маскарады. Прад сьвятынямі: у Менску, Барысаве, Полацку

і ў іншых местах саюз бязбожнікаў ладзіў проціўрэлігійныя мітынгі, якія аднак на масах ня мелі ніякага ўплыву.

Арышт б. пасла Рак-міхайлоўскага. Расейская газэта „Н. Вр." падае, што быццам бальшавікі арыштавалі б. пасла Рак-Міхайлоўскага, які нядаўна выехаў у Менск. Паводле вестак „Н. Вр." бальшавікі прыпомнілі Рак-Міхайлоўскаму яго працу ў Беларускай Вайсковаи Камісіі ў 1919—1920 г., за што і пасадзілі ў турму. Вестка гэта пакульшто неправерана.

З Незалежнай Літвы.

Музэй Вітаўта Вялікага. У Коўне мае быць пабудаваны будынак пад музэй ім. Вітаўта Вялікага. Ужо распачатыя работы дзеля будовы гэнае будыніны.

Народныя унівэрсытэты У мінулым годзе ў Незалежнай Літве шмат дзе арганізаваны народныя унівэрсытэты ім. Басановіча. Гэта так важная праца вядзецца і далей.

Т-ва асвабаджэньня Вільні, якое існуе ад многіх гадоў у Коўне, ад сёлетняга году будзе прымаць у сябры ўсіх грамадзян Літвы, нават і Палякаў. Орган гэтага Т-ва „Musu Vilnius" мае быць павялічаны.

З ЛІТВЫ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Зьезд вучыцялёў 30 і 31 XII. 1930 г. адбыўся ў Вільні зьезд літоўскіх вучыцялёў. Зьезд выказаў працаздольнасьць і ахвоту да працы літоўскага вучыцельства на ніве літоўскай народнай асьветы. На зьездзе абгаварывалася і справа ўзгадаваньня літоўскай вясковай моладзі.

Спатканьне Новага Году. Літоўскія вучыцялі, спаўняючы сваю грамадзкую працу на зьездзе, адначасна наладзілі ўрачыстае спатканьне Новага Году, на якое апрача вучыцялёў запрасілі так-жа шырокія кругі літоўскага грамадзянства. На спатканьні Новага Году між іншым былі прачытаны дзьве лекцыі аб Вітаўце Вялікім і адыграна п'еса „Meiles Salibe" (Сіла любові).

Чытайце і пашырайце „БЕЛАРУСКУЮ КРЫНІЦУ".

З Украінскага жыцьця.

Юбілей Т-ва „Рідній Школі." Сёлетні 1931 год ёсьць юбілейным годам 50-ці гадовай культурна-народнай украінскай працы таварыства „Рідній Школі". Т-ва гэна вельмі многа дало карысьці Украінскаму народу сваей культурнай і народна-прасьветнай працай за працяг 50 гадоў свайго існаваньня. Дзякуючы працы „Рідній Школі" украінскі народ мае густую сетку народных школ, у якіх узгадовываецца залог будучыні народу Украінскага — украінская моладзь.

З нагоды гэтага юбілею выражаем пажаданьні „Рідній Школі" плоднай працы дзеля сьветлай будучыні братняга нам Украінскага народу.

З жыцьця украінцаў і беларусаў у Амэрыцы

Беларусы на ўкраінскіх пратэстацыйных вечах. За кастрычнік і лістапад 1930 г. па найвялікшых местах Злучаных Штатаў адбылося многа вечаў украінскай эміграцыі ў справе „пацыфікацыі" і інш. выпадкаў у Галіччыне. На некаторых з гэтых вечаў выступалі таксама й беларусы: у Вілкес Бэры, Пэнсылвэнія — Кс. д-р Я. Тарасэвіч; у Шыкаго, Іллыной — Янка Чарапук; у Вест Пуллман, Іллыной — Язэп Варонка.

З Польшчы.

Выбарныя пратэсты. На прошлыя выбары ў Найвышэйшы Суд падана 129 пратэстаў з рожных вокругаў.

Найвышэйшы Суд пачне разглядаць гэтыя пратэсты ад палавіны г. м.

Берасьцейская вязьніца і грамадзкая апінія. У зьвязку з інтэрпэляцыяй, якая падана ў Сойме апазыцыяй у справе зьдзекаў над палітычнымі вязьнямі—пасламі ў Берасьцейскай турме, у Польшчы пачаліся супроць такіх паступкаў пратэсты. Выступілі з пратэстамі прафэсары унівэрсытэтаў, жаночыя арганізацыі, адвакаты і г. д.

Газэты апазыцыйных да ўраду кірункаў, высьвятляючы справу Берасьцейскіх вязьняў, заклікаюць да маральнага аздараўленьня.

Марш. Пілсудскі выехаў на Мадэру аддыхаць. Язэп Пілсудскі пасьля выбараў паехаў аддыхаць на цёплыя воды на востраў Мадэру (востраў на Атлянтыцкім акіяне). Газэты падаюць, што на Мадэру паехалі з Польшчы 42 сышчыкі.

Чатыры мільёны запратэставаных вэксалёў. Паводле статыстычных падлічэньняў у Польшчы за тры апошнія кварталы 1930 г. запратэставана 4.200.000 вэксалёў на суму 1.027.000.000 зл. Найбольшы лік запратэставаных вэксалёў прыпадае на цэнтральныя ваяводзтвы.

Манаполь на соль. Газэты падаюць, што ў хуткім часе выйдзе распараджэньне аб манапольнай прадажы солі ў ва ўсей Польшчы.

Лодзкія фабрыкі па 6 тыдняў „аддыхаюць." „Rozwój" лодзкі падае, што найбольшыя фабрыкі ў Лодзі ўстрымалі на 6 тыдняў працу. Работнікі, апынуўшыся без заработкаў, зьвярнуліся да віцэ-міністра працы з сваёй бядой, які пацешыў работнікаў, што будзе старацца, каб фабрыкі не ўстрымлівалі працы.

З заграніцы.

Мова папы. У прададні Каляд папа сказаў да кардыналаў вялікую мову, якая закранула найбольшыя балячкі нашага часу. Мову гэту перадрукавалі і не шчадзілі ей сваей пашаны газэты бадай усяго сьвету розных кірункаў. Найцікавейшай справай, якую папа закрануў у сваеи каляднай мове, была справа супакою на сьвеце. Папа сказаў ясна, што трудна ды і немагчыма ня выклікаць узноў страшнай вайны, калі не пайсьці насустрэч інтарэсам пакрыўджаных клясаў, не зьвярнуць належнай увагі на барацьбу між капіталам і працай і калі урэшце народы замест праўдзівай любові сваей бацькаўшчыны будуць разьвіваць сьляпы нацыяналізм і крыўдзіць народы слабейшыя. Выступаючы гэтак рэзка проціў вайны, Папа паўтарыў словы Сьв. Пісаньня: Божа, зьнішто-ж народы, каторыя вайны хочуць...

Сэсія Лігі Народаў, якая пачнецца 19 студня с. г., мае разгледзіць каля 30 спраў. Між іншымі на гэтай сэсіі Лігі будуць раз-

Беларускі выдавецкі рух у Зах. Беларусі за 1930 г.

У працягу 1930 году ў Вільні вышлі з друку й паступілі ў продаж наступныя беларускія выданьні: зл.

Астроўскі Р.: — Беларускі правапіс. Выданьне 2-ое папраўленае і дапоўненае. Выданьне Б. Клецкіна. Вільня 1930 г. Бачынаў 148 . . . . 3.00

Bahušewič Fr.: Dudka Bełaruskaja. Wydańnie Biel. Inst. Haspadarki i Kultury ŭ 30-ja ŭhodki śmierci Fr. Bahušewiča. Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 56 . . . . . . 0.50

Bahušewič Fr.: Smyk Biełaruski. Wydańnie Biel. Inst. Hasp. i Kultury ŭ 30-ja ŭhodki śmierci Fr. Bahušewiča. Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 32. . . . . 0.60

Bahušewič Fr.: Dudka Biełaruskaja i Smyk Biełaruski. Z krytyčnym narysam ab žyćci i tworčaści Fr. Bahušewiča ŭ 30-ja ŭhodki Jahonaj śmierci. Wydańnie Biel. Inst. Hasp. i Kultury. Wilnia 1930 h. Bačynaŭ (52+56+32) = 140 . . . . 1.50

Божая Ліра — Хрысьціянскія Духоўныя Песьні. Мэтадыстаўскі беларускі сьпеўнік з нотамі. Выданьне П.-Амэрыканскай Акц. Супалкі „Southern Trade". Вільня 1930 г. Бачынаў 204 . . . 6.00

Божая Ліра — Хрысьціянскія Духоўныя Песьні. Мэтадыстаўскі беларускі сьпеўнік (Тэксты да нотаў). Выд. П.-Амэр. Акц. Супалкі „Southern Trade". Вільня 1930 Бачынаў 186 . . . . . . 2.00

Bylina J.: Daroha Kryža, Nabaženstwa na Wialiki Post. Wyd. „Chryścijanskaj Dumki". Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 32 . . . . 0.30

Hadleŭski W. Ks.: Świataja Historyja Staroha Zakonu. Wyd. „Biel. Katalickaha Wydawiectwa". Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 152 . . . . 2.00

Календар адрыўны на 1931 г. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Вільня 1930 г. 1.25

Календар адрыўны на 1931 г. Т-ва „Культура". Вільня 1930 г. 0.95

Календар — кніжка на 1931 г. Беларускі Гаспадарскі Календар „Рольнік". Выд. У. Знамяроўскага. Вільня 1930 г. Бачынаў 164 . . . . 1.50

Каталёг (кнігасьпіс). Выд. Т-ва „Пагоня". Вільня 1930 г. Бачынаў 56 . . . .

Kazłoŭščyk Ul.: Biełaruskija narodnyja pieśni z Sakolskaha pawietu. Wyd. „Biel. Krynicy". Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 40 . 0.25

Kazłoŭščyk Ul.: Płač biełaruskaj staronki Matki pa dzietkach swaich renehatach. Wyd. Janki Bahdanowiča. Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 24 . . . . 0.30

Маркс К.: 18-ае блюмэра Люі-Бонапарта. Выд. Бел. Сял.-Раб. Пасольскага Клюбу. Вільня 1930 г. Бач. 119 . . . 2.50

Станкевіч Ад.: Вітаўт Вялікі і Беларусы (Рэфэрат чытаны на ўрачыстай акадэміі ў Вільні 27.X.1930 г., у дзень 500-лецьця сьмерці Вітаўта, Вялікага Князя Літоўска-Беларускага). Выд. Бел. Нацыянальнага Камітэту ў Вільні. Вільня, Год Вітаўта Вялікага 1930. Бачынаў 31 . . . . 0.50

Stankiewič Ad.: Franciš Bahušewič. Jaho žyćcio i tworčaść. U tryccatyja ŭhodki (1900-1930). Wyd. Biel. Inst. Hasp. i Kultury. Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 50 . . . 0.60

W. A.: Jak Hanula źbirałasia ŭ Arhientynu. Wyd. „Chr. Dumki". Wilnia 1930 h. Bačynaŭ 30 . . . . 0.25

Выданьні аб Беларусі ў чужых мовах.

ПАЧЭСКУ:

Iljašewič Mik. Dr.: Belorus a Belorusove*) s 1 mapou a 13 illustracemi. Nakladem „Českeho Čtenare" v Praze 1930. (Падручны інфарматар заграніцы аб Беларусі. Бачынаў 126) 3.00

*) Пабеларуску: „Беларусь і беларусы".

ПАПОЛЬСКУ:

Sprawa-Neumann Wacław kpt: Białoruś Sowiecka. Szkic wojskowo-geograficzny i statystyczny. Nakł.: Wojskowy Instytut Naukowo-Wydawniczy. Warszawa 1930 h. Адбітка з „Bellony". Бачынаў 63 . . . 1.50

Беларуская віленская прэса у 1930 г.

1. **„Беларуская Крыніца"**, палітычная, грамадзка-гаспадарчая і літэратурная газэта, орган Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі (Б. Х. Д.). Найстаршы з істнуючых беларускі тыднёвік (ад 1917 г.), выходзіць наперамен: раз гражданкай, раз лацінкай. Адрас: Вільня, Людвісарская 1-19.
2. **„Беларускі Кліч"** — палітычны, грамадзкі і літэратурны тыднёвік беларускай незалежніцкай думкі. Выходзіў падчас выбараў.
3. **„Сялянская Ніва"**, тыднёвік, орган Беларускага Сялянская Саюзу. Часова ня выходзіць.
4. **„Наперад"**, тыднёвік. Орган беларускіх полёнафілаў. Перастаў выходзіць.
5. **„Сьвітаньне"**, орган беларускіх радыкалаў з б. Пас. Клюбу „Змаганьне", перастаў выходзіць.
6. **„Народны Звон"**, тыднёвік, орган полёнафільскага „Цэнтрасаюзу". Выходзіў падчас выбараў.
7. **„Chryścijanskaja Dumka"**, biełaruskaja katalickaja hazeta, dwutydniowik relihijna-hramadzkaj dumki; wychodzie ad 1928 h. ŭściaž. Adres: Wilnia, zawułak św. Mikałaja 8-3.
8. **„Шлях Моладзі"**, месячная часопісь беларускай моладзі. Выходзіць ад 1929 г. ўсьцяж. Адрэс: Вільня, Завальная 6-10.
9. **„Вучнёўскі Звон"**, часопісь беларускай вучнёўскай моладзі, ня выходзіць.

гледжаны дзьве цікавыя справы: польска-літоўскага спору і справа нямецкай народнай меншасьці пад Польшчай.

Банкроцтва банкаў у Амэрыцы. Газэты падаюць, што ў Зл. Шт. Паўночнай Амэрыкі некалькі дзесяткаў банкаў спыніді ўсякія выплаты. Заквэстыянаваных унісаў гэтых банкаў налічваецца на 400 міліёнаў даляраў.

Галоўнай прычынай банкроту гэтых банкаў ёсьць земляробскі крызыс. Сярод збанкрутаваных банкаў пераважна тыя, якія займаліся апэрацыямі выключна гандлю збожжам.

З Краю.

Няўжо забываюцца кірыліцы? Сабраньне праваслаўнага духавенства Маладэчанскага пав. пастанавіла друкаваць школьныя падручнікі для вывучэньня закону Божага ня кірыліцай, а лацінкай. Пастанова гэта матывавана быццам тым, што моладзь, якая вучыцца ў польскіх школах, ня знае кірыліцы.

Недахоп сернікаў. Пасьля весткі аб заключэньні праз урад дагавору пазыкі сернікавай, у Горадні адчуўся недахоп сернікаў, на якія аднача сна падняялася і цана да 10 грошаў за скрыначку, г. зн. да тае цаны, якая будзе пасьля тэрміну, ад якога пачне абавязываць гэты дагавор.

Пажары. У апошнія часы ў Сьвіры згарэў адзін дом і два іншыя будынкі. У в. Дубово, Кемелiскай гм., Віл.-Троцкага пав. згарэлі два гумны. У в. Паніжанах гм. Жодзішнай, Вілейскага пав., згарэла 8 гаспадароў. У Слоніме ў кляштарным будынку сясьцёр непакалянак згарэла аранжарэя. Згарэлі вельмі цэнныя пальмы.

Гмінная Рада з дапамогай Навагрудзкай Бел. Гімназіі. Дварэцкая Гм. Рада пастанавіла даць запамогу для бурсы пры Навагрудзкай Беларускай гімназіі ў суме 100 зл.

Не зважаючы, што радны Адольф Рысюк вельмі востра выступаў проціў праекту дапамогі для беларускай інстытуцыі, хваля чыся, што ён наагул не прызнае Беларускага народу, аднак у Радзе знайшлася большасьць радных, якія не паслухалі бязглуздых цьвярджэньняў Рысюка.

10. **„Студэнская Думка“** орган беларускага студэнства з „АБСА“. Выходзіць нерэгулярна. Адрэс: Вільня, Віленская 8-3.
11. **„Саха“**, месячнік сельскае гаспадаркі і кооперацыі. Выходзіць усьцяж. Адрэс: Вільня, Віленская 8-3.
12. **„Родная Мова“**, часопісь для пытаньняў па мовазнаўству, ня выходзіць.
13. **„Сьветач Беларусі“** орган Беларуская Праваслаўнага Камітэту (Вярнікоўскі, Сарока). Перастаў выходзіць.
14. **„Проч з ліхазельлем“**, ананімная аднадзнёўка.

* * *

Гэтак у сухіх лічбах прадстаўляецца беларускі выдавецкі рух у Заходняй Беларусі за мінулы 1930 год. Лічба невялікая, праўда. Але, калі прыняць пад увагу нябывала цяжкія гаспадарчыя і палітычныя ўмовы беларускай працы ў мінулым годзе, дык колькасьць і якасьць выкананай беларускай выдавецкай працы трэба сапраўды падзівіцца.

Другое, што кідаецца ў вочы, гэта тое, што на выдавецкім полі сусём замерлі тыя, што прывыклі усабляць сабой увесь беларускі рух. Затое ціхая й скромная праца людзей згуртаваных каля „Бел. Інст. Гасп. і Культуры“ і „Бел. Крыніцы“ дала рэальныя вынікі сусём пахвальныя: пладом іхняй працы за мінулы год аказаліся амаль 60 працэнтаў (57.89) усіх непэрыодычных беларускіх выданьняў і роўна 75 прац. усых выданьняў пэрыодычных.

Гэта — сапраўды праца!

Аглядчык.

Купляйце „НОВУЮ ЗЯМЛЮ,“ найлепшы твор—поэма Я. Коласа, вышаўшую сьвежа з друку і выданую Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры. Галоўны склад кнігарня „Пагоня,“ Вільня, Бэдвісарская 1. Цана 2,50 зл.

Ноч.

Ціха. Нішто не зварушыць спакою пад небам,
Вёска так моцна заснула па працы будзённай...
З неба шмат зорак цікавіцца людзкім патрэбам,
Зоркі ўглядаюцца ўверх з вады рэчкі
[студзённай.

Сьпяць ачароты ля возера ціха, спакойна,
А воды люстраны іх цень ясна адбілі;
Хмаркі над імі расшыраліся пасамі стройна,
Іншыя ў горбах на ясным стаяць небасхіле.

Сьпіць родны край мой, чакаючы дзіўнага
[ранку,
Ночнымі чарамі скованы, быццам астрожнік,
Сьпіць, пакуль зьявіцца ў раньнім убраньні
[на ганку.
Сьведка вякоў і нябесных шляхоў падарожнік.

І. В.

Да ведама карэспандэнтаў і падпішчыкаў „Бел. Крыніцы“.

Многія карэспандэнты і падпішчыкі пішучы ў рэдакцыю карэспандэнцыі або пісьмы асабістага характару не падаюць свайго дакладнага адрасу, або пішуць яго няявразна. З гэтае прычыны рэдакцыя ня можа належна спаўніць тае справы, з якой зьвяртаецца інтэрэсант.

Дзеля гэтага просім у пісьмах і карэспандэнцыях для ведама рэдакцыі падаваць свой дакладны, выразна напісаны адрас: — пошту, вёску, гміну, павет, імя і прозьвішча.

Што рабіць, калі не даходзіць газэта. Хто прасіў, каб ня спыняць яму нашай газэты, рэдакцыя газэту высылае паводле паданага адрасу. Калі газэта не даходзіць, трэба дамагацца яе на пошце. Калі-ж паштовы ўрадавец скажа, што газэта ня прышла, трэба прасіць, каб даў гэткае пацьверджаньне на пісьме. Калі-б урадавец адмовіўся даць такое пасьведчаньне, можна тады заявіць у паліцыю, каб яна сьпісала аб гэтым пратакол. Тады аб усім гэтым напісаць у рэдакцыю, а рэдакцыя падасьць скаргу Паштовай Дырэкцыі. Такім парадкам можна направіць усю гэту эльібяду і газэта будзе даходзіць рэгулярна.

Рэдакцыя.

Усячына.

Ад 1918 да 1930 г. 17 войнаў. У 1918 г. заключаны мір у Вэрсалі, каб спыніў вялікую сусьветную вайну. Ад таго часу выглядае, што на сьвеце спыніліся войны. Тымчасам у працягу 12 гадоў ад 1918 да 1930 году адбылося аж 17 войнаў, не лічачы ні вайны ні міру Літвы з Польшчай.

Пералічым гэтыя войны па парадку:

1919 год. Контррэвалюцыйная вайна ў Расеі. Пяць арміяў аднача сна ў рожных мяйсцох ваююць з бальшавікамі — Врангель, Дэнікін, Юдзеніч, Авалаў-Бэрмонд і Калчак.

У тым самым часе вугарскія бальшавікі нападаюць на Славаччыну. Вайна ў Афганістане. Першая вайна Турцыі з Грэцыяй.

1920 год. Вайна Польшчы з бальшавікамі. Другая вайна Турцыі з Грэцыяй.

1921—1922 год. Польскае паўстаньне на Шлёнску. Трэцяя вайна Турцыі з Грэцыяй.

1923—1924 год. Хатняя вайна ў Кітаі.

1925—1926 год. Вызвольная вайна Рыффаў з вайскамі Гішпаніі і Францыі. Паўстаньне ў Сырыі.

1927—1928 год. Вайна ў Кітаі паўночнай арміі з паўдзённай.

1929 год. Вайна Болівіі і Парагваю. Вайна Кітая з Саветамі за ўсходня-кітайскую чыгунку.

Цудоўнае аздараўленьне ў Люрд. З ліку цудоўна аздараўшых у Люрдзе, якія запісаны апошнімі днямі камісіяй, зьвяртае ўвагу цудоўнае аздараўленьне аднае маладой французжанкі.

Дзяўчына гэтая мае 18 гадоў і паходзіць з сухотніцкай сям'і. Ад 14 гадоў усё цела яе было ў адных адкрытых ранах. Дахтары адмовіліся яе лячыць, заявіўшы, што хвароба гэтая не вылечальная.

Дзяўчына паехала ў Люрд і пасьля першага там купаньня ў вадзе, раны пачалі

Да нас пішуць.

ЯК АДБЫВАЛІСЯ Ў НАС ВЫБАРЫ.

Ісказьнь, Браслаўскага пав. Шмат пісалася аб „выбарчых навінах“, напішу крыху аб іх і я.

Такіх выбараў, як былі сёлета, ніхто не памятае. Цяжка Беларусам было ў 1928 г. выбраць сваіх паслоў, але ўсёж-такі лягчэй, чым у гэтых выбарах 1930 г. Вялікая зьмена ў спосабе выбараў зайшла за апошнія два гады.

Сёлета прад выбарамі прыехаў у нашае мястэчка войт, загадаў сабраць сход, на сходзе пахваліў урад Пілсудскага і казаў, каб галасавалі за „адзінку.“ Хто мог асьмеліцца не паслухаць войта?

У часе выбараў прыехаў ізноў войт і „заагітаваў“, каб галасавалі яўна. Палохлівыя адразу паслухалі і пачалі падыходзіць да ўрны выстаўіўшы адзінку. Адважнейшыя галасавалі па старому—закрыта. Пасьля гэтага старшыня камісіі загадаў запісываць, хто галасуе яўна, а хто закрыта. Тут ужо і адважнейшым „заяц“ дарогу прабег, а каб усьцерагчыся якое-небудзь біды, давай шукаць „адзінак“ і выстаўіўшы падыходзіць да урны. Былі выпадкі, што дэмонстранты яўнага галасаваньня сьпярша нешта пісалі на адваротнай старане „адзінкі“, а пасьля яе выстаўлялі і адкрыта гэткім нумарам галасавалі.

Мяне нічуць ня дзівіць, што некаторыя людзі, якія стаяць далей ад вёскі, ломяць сабе галовы і ня могуць зразумець, як гэта сталася, што беларусы не правялі аніводнага пасла.

Усім, каго гэтая справа цікавіць, раджу паехаць нават у самую глухую беларускую вёску, а там кожны дзядзька Ігнат, Франук ці Пятрук яму гэту штуку раз'ясьніць найдакладней.

Крывіч.

ПАШЫРАЙМА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ СЬВЕДАМАСЬЦЬ І СВАЮ КУЛЬТУРУ!

в. Сьвіране, Баранавіцкага пав. Наша вёска вялікая, мае 105 сем'яў. Моладзі шмат. Усе беларусы. Адна біда, што да нас не заглянула яшчэ аніводная беларуская газэта. Моладзь ахвочая да арганізацыі пайшла ў рожныя польскія „кулкі“. Але ў гэтых „кулках“ чужая нам мова і чужы дух. Дык нічога да нашай моладзі не прыстае. Бачачы гэтую трагэдыю нашай моладзі, зацікавіўся я яе лёсам. Выпісаў з Вільні беларускую газэту і зьбіраюся залажыць гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Спадзяюся, што ў сваей арганізацыі моладзь наша будзе чуцца йнакш і здабудзе ў ёй многа карыснага для сябе і народу.

Мікчэр.

ПАЛЯНІЗАЦЫЯ НЕ ЎДАЕЦЦА.

Дрысьвяты, Браслаўскага пав. У нас насельніцтва каталіцкае, але не палякі, а беларусы. Сьведамасьць нацыянальная ўжо пашырылася. Ахоплівае беларускасьць і нашу моладзь. Ксёндз сьпярша пробаваў нашу моладзь праз каталіцтва паланізаваць, але яму гэта нёўдалося. Быў ён залажыўшы польскае „стоважышэнэ“ моладзі і прыказ-

[redacted]

гаіцца. За тыдзень хворая зусім аздаравела.

Дахтары, якія лячылі яе сьпярша, абгледзіўшы сваю пацыентку, заявілі, што яна зусім аздаравела.

Арыгінальная карэспандэнцыя з Расеі. Амэрыканскія газэты пішуць, што на калодах дрэва, якое бальшавікі прадаюць Амэрыцы, спатыкаюцца вельмі цікавыя надпісы. На адной калодзе было напісана 250 слоў пад загалоўкам „Страшныя варункі працы ў савецкіх абозах“. На гэтай калодзе піша нявядамы карэспандэнт, што тысячы людзей гінуць у савецкіх абозах ад марозу, бо ня маюць адпаведнай вопраткі. Людзі, высахшыя ад голаду, падобныя да шкілетаў, мусяць насіць цяжкія калоды дрэва. Кожны работнік дастае ў дзень толькі па паўфунта хлеба.

Новыя мучанікі ў Кітаі. Ад 1924 г. у Кітаі згінула мучаніцкай сьмерцяй 30 духоўнікаў хрысьціянскіх: 8 бэльгійцаў, 7 італьянцаў, 5 кітайцаў, 3 амэрыканцаў, 3 французаў, 2 немцаў, 1 гішпанец і 1 ірляндзец. Нядаўна кітайцы павесілі яшчэ аднаго духоўніка — кітайца.

081530

ваў маладзяжы пад пагрозай касьцельнай кары належаць да гэтага „стоважышэня", але не памагло і гэта. Народнае беларускае пачуцьцё перамагло. Польскае „стоважышэне" развалілася.

Дарагая моладзь, выпішы сабе беларускія газэты: „Бел. Крыніцу", часопісь беларускай моладзі „Шлях Моладзі" і „Хрысьціянскую Думку", зарганізуй гуртох Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры, выпішы беларускіх кніжак і залажы біблятэку-чытальню. Такім чынам будзеш разьвіваць свой малады розум і ўсьцеражэшся ад злых навыкаў, а праз гэта паправіш свой лёс на будучыню.

А. С.

КРЫХУ АБ ВЫБАРАХ І НОВАЙ АКЦЫІ КАМУНІСТАЎ.

Новаельня, Наваградзкага пав, У нас адбыліся выбары так, як і ўсюды. Дзіўна толькі, чаму № 11 так мала атрымаў галасоў. У нашай адной гміне № 11 было 450, а Наваградзкі вокруг мае 5 паветаў і ўсе паветы чыста беларускія. Няўжо-ж беларускі голас заглушыла аркестра, якая вадзіла выбаршчыкаў на галасаваньне, дзе галасавалі адкрыта? Праўда, што было многа і іншых штучак, аб якіх сяляне будуць васьці гутаркі доўгі час, пераказваючы адны другім ўсё штораз новыя і пацяшнейшыя.

Пры гэтым трэба сьцьвердзіць факт, што нашы вяскоўцы ўжо пазналіся на падшывальвіках да сялян камуністых і гоняць іх ад сябе вон. З прычыны мусіць гэтае камуністы пачынаюць падыходзіць да нашых вяскоўцаў з польшчынай, распаўсюджываючы газэту „Przegląd społeczny". Але польшчынай ім яшчэ больш не ўдаецца баламуціць беларусаў. Наш беларус ужо ведае, што камувісты робяць з беларусамі ў Радавай Беларусі. Ш—к.

ЦЁМНЕНЬКА Ў НАШАЙ ВЁСЦЫ.

Лаські, Пастаўскага пав. У нашай вёсцы так цёмна, што ніяк сюды ня можна травіць і родная газэта. Прысылае ў нашу вёску ксёндз нейкую газэціну, якая называецца „Наш Пшыяцель", але з яе карысьці ніякай.

Адзін раз была заблудзіўшы да нас „Бел. Крыніца", спадабалася яна нашым сялянам і ўжо хацелі яе выпісаць. Але зае нам да свайей газэты! У вёску газэта толькі заблудзіла — нехта прынёс, а ўжо паліцыя была гатова лавіць у нашай вёсцы „бальшавікоў"!. Дзеля таго, што ў нас бальшавікоў няма, дык сяляне „дагадаліся", што паліцыі данесена аб „Бел. Крыніцы". Спужаліся і закінулі думку выпісаць свае газэты.

Годзі баяцца няясную сцетрахаў. Газэту выпісваць і чытаць можна.

Я.

ЦІХАЯ ДЭМОСТРАЦЫЯ.

Берасьце,—гэта тое самае „слаўнае" Берасьце, аб якім цяпер пішуць і заграніцай. У часе выбараў у нашым Берасьцейскім вокрузе ў абводзе №18, беларусы, ня маючы нумару да галасаваньня, ціха дэманстравалі. кідаючы белыя карткачкі. Такім парадкам накідалі 119 белых чыстых картачак. Ясна, што з гэтага карысьці ніякай, але і другога выхаду ня было, бо галасаваньне і ў нас было такое самае, як і ў ва ўсіх другіх беларускіх вокругах. В. С.

ГРАМАДЗКАЯ СПРАВА БЕЗ ЗАЦІКАЎЛЕНЬНЯ ГРАМАДЗЯНСТВА.

Казлоўшчына, Пастаўскага пав. Аб тым, што гмінная гаспадарка належыць да ўсяе гміны, кожнаму ясна. Ня ясна толькі, чаму кіраўніцтва гэтай гміннай гаспадаркай ідзе аднекуль згары і чаму аб гэтым кіраўніцтве найменш ведае грамадзяніе гміны—селянін.

З прычыны гэтае ўсялякія абавязкі адносна гміннай гаспадаркі селяніну проста цяжар і прыпамінаюць прыгон.

У гэтай справе трэба, каб аб усім ведала гмінная рада, якая павінна быць выбірана сусім свабодна праз грамадзян гміны. Тады толькі грамадзяне гміны змогуць зразумець, што справа гміннай гаспадаркі — гэта агульная справа цэлае гміны,

С. К—ч.

ТРЭБА ЗАКЛАДАЦЬ КООПЭРАТЫВЫ.

Каб наш селянін ведаў, што коопэрацыя зьнішчыць можа шмат яго бяды, напэўна думаў-бы, як-бы закладаць коопэратывы. Праўда, тады пагінулі-б прыватныя крамкі, але затое пачала-б багацець вёска.

Дык думайма над гэтай справай!

Ф. К.

„ВЯСКОВЫ ПАШТАР".

в. Бараўкі, Пастаўскага пав. Наша вёска чыста беларуская. Жыхары яе — палавіна праваслаўных, а палавіна каталікоў. Праваслаўных ўсе сьведамыя беларусы, а каталікі некаторыя называюць сябе палякамі, бо „польскай веры". Солтыс наш, які выконвае ролю і вясковага паштара, таксама ўважае сябе за паляка, бо ён каталік.

Гэты солтыс прад выбарамі разносіў па хатах „адзінку" і заказываў, каб ішлі на галасаваньне з гэтым нумарам. Гэты самы солтыс, ён разам і вясковы паштар, заўсёды забірае з пошты ўсю карэспандэнцыю для цэлай вёскі. У часе выбараў гэты наш паштар адыграў не малую роль у недаручэньні ў належны час выбарчых адозваў і газэт ад № 11.

У нашай вёсцы, „Бел. Крыніцу" № 30 з 9 лістапада і „Беларускі Кліч" № 2 з 7 лістапада солтыс-паштар даручаў падпішчыкам толькі пасьля галасаваньня,25 лістапада.

З прычыны гэтай сяляне ня ведалі, на які беларускі нумар галасаваць, ці на № 11 ці на № 22.

Не атрымліваючы газэт, сяляне наракалі на рэдакцыю, што не высылае. Аж па выбарах толькі даведаліся, што гэту штуку "ўдраў" наш „вясковы паштар" М. Балаш.

Вось з гэтым чыстая бяда. На пошце нашаму селяніну газэт не аддаюць, кажучы, што солтыс прыняе яе падпішчыку нават да хаты, а солтыс трымае газэты па два тыдні недзе схаваўшы і кажа, што ня прыйшлі. Ня ведама, чаму гэта паштовыя ўрадаўцы ня хочуць, каб сяляне самі прыходзілі на пошту па газэты, мусіць ня любяць кажуховага запаху, ці мо' таксама ня хочуць, каб сяляне ў час атрымлівалі газэты.

Дык вось, як трудна было даведацца на вёсцы, за які нумар трэба было галасаваць Беларусам. Выбаршчык.

Аб гаспадарцы.

Правілы добрага абходжаньня з гноем.

Хляўны гной быў, ёсьць і будзе найлепшым з усіх гнаёў. Яго трэба толькі адпаведна ўмела пераховываць, кіруючыся гэтымі правіламі.

1. Усюды там, гдзе хлявы зімныя (у нас гэта ёсьць правілам), найлепш пераховываць гной пад жывёлай у хляве.

2. Хлеў мусіць быць на непрапускным грунце, каб у зямлю не выпаласківалася, ані на бакіня вылівалася найцаньнейшая складовая частка гною — мача, якая памагчышэці ўся мусіць быць або затрымана ў гнаі, або адведзена сумысьнымі раўкамі ў асобны басэйн.

3. Гной у хляве трэба штодня раўняць, старанна перамешываючы яго пры гэтым з падсьцілкай.

4. Там, дзе ўвесь гной праз цэлую зіму ня можа зьмясьціцца пад жывёлай, яго трэба выкідаць на гнойвішча, якое мусіць быць заложана таксама на непрапускным грунце.

5. Гной на гнойвішчы трэба ўкладаць роўнымі, грубымі, але няшырокімі пластамі і старанна ўтоптываць, каб вонкавае паветра мела да яго найменш доступу.

6. На гнойвішча, дзеля ўтоптываньня, можна і трэба выганяць скаціну, але нельга туды пускаць сьвіней (рыюць), а нават курэй (раскопываюць).

7. Як пад хлеў, так і пад гнойвішча нельга пазволіць, каб падплывала дажджавая вада, якая выпаласківае з гною ўсё, што ёсьць у ім найлепшага.

8. Якасьць гною, апрача абходжаньня з ім, залежа йшчэ ад роду жывёлы (скаціна, авечкі, коні, сьвіньні), ад веку і ад спосабу кармленьня.

9. Вывозіць гной найлепш пры пахмурнай пагодзе; але заворываць яго ў мокрую зямлю ёсьць адным з найбольшых гаспадарскіх грахоў.

10. Мача разьведзеная з вадою ёсьць вельмі добрым угнаеньнем, асабліва на сенажаці. А. К.

„Беларуская Крыніца"

у месяцы студні с. г. выходзіць дня 10, 20 і 30-га. У м-цы лютым газэта будзе выходзіць што тыдзень.

З Вільні.

Прыезд у Вільню літоўскага міністра. У часе Каляд быў у Вільні літоўскі міністар камунікацыі Вілейшыс, які пры'яжджаў у Вільню на пахавіны сваей маткі.

Раптоўны ўзрост безрабоцьця. За апошні тыдзень безрабоцьце ўзрасло на 227 асоб. Агулам у Вільні налічваецца 3559 безработных.

Віленскія адвакаты проціў абходжаньня з вязьнямі ў Берасьці. Пасьля пратэстаў прафэсараў проціў біцьця і іншых зьдзекаў над вязьнямі ў Берасьці, запратэставалі таксама і віленскія адвакаты.

Наша пошта.

Тункуну. Пісьмо атрымалі, газэту пасылаем. Адносіны ксяндза да Паўкшты выключна касьцельнага характару і ў справы такія мы ня ўмешываемся.

Радабольскаму. Газэту пасылаем. Адкрыйце ў сваей арганізацыі беларускую біблятэку-чытальню. Кніжкі можна выпісаць з беларускай кнігарні „Пагоня"—Wilno, Ludwisarska 1.

Патрэбічу. У будаўляную школу паступіць можна толькі вясной у месяцы траўні. Трэба мець 16 гадоў і 4 кл. паўшэхнай школы. Гэта школа бясплатна і кормяць, але трэба пры будове прыцаваць.

Лукшу. Апошняе каровы за падаткі прадаваць ня можна. Віноўных перадайце ў суд праз пракурора.

Белюку. Ад Вас атрымалі 3 зл. 29.X 1930 г. і запісалі на Ваш рахунак. Пасылаем газэту і Вашаму брату Юльяну. Вам газэту пасылаем, як карэспандэнту.

Хадаркевічу. Газэту Вам пасылаем. Пазнаёмцеся з праграмай і партыяй Б.Х.Д. На жаданьне друкі вышлем.

Шпаку. Дзякуем, карыстаем, пішыце аб жыцьці сялян. 2.І. атрымалі яшчэ 2 карэспандэнцыі.

Пупіну, каля Замоша. Вы ў пісьме не ўпісалі свайго адрасу, дзеля гэтага ня можам Вам выслаць акуратна газэты. Ваша адозва да моладзі не падходзіць. Пішыце, што ў Вас чуваць.

Кіёнку. У справе затрыманьня газэт вясковым солтысам напішыце ў Дырэкцыю Пошты ў Вільні, апісаўшы ўсе факты, копію прышліце ў рэдакцыю.

Цыбнэлю. Газэты Вам ніколі ня спынялі, чаму Вы не атрымліваеце, ня нашая віна. У справе адкрытага пісьма высылаем Вам прыватнае пісьмо.

Лагуненку. Газэту пасылаем, пашырайце друкаванае слова. Каб на далей сяляне не даліся ашукаць, трэба іх усьведамляць. Залажыце гуртох Бел.Інст. Г. і Культ., выпішце беларускіх кніжак, адкрыйце біблятэку-чытальню, давайце чытаць сялянам кніжкі, ладзьце рэфэраты, прадстаўленьні і пашырайце сьведамасьць. Гэткай працай пабудземіся цемры і гора.

З. Трофімовічу. Газэту Вам пасылаем. Грошы высылайце на адрасу: — Wilno „Biel. Krynica", Ludwisarska 1 — 19 пераводам паштовым. На адрэсцы напішыце, якія высылаць кніжкі.

Храпану. За газэту Болочку 3 зл. атрымалі 6.X. 30. Заплачана да 1 VI. 31. Газэту пасылаем заўсёды, трэбуйце на пошце. „Бел. Кліч" ня выходзіць.

Сінкевічу Альбіну. 9 зл. атрымалі, 4 зл. залічылі за „Б. К.", а рэшта перадалі „Ш. М." і „Х. Д." Вышлем Вам прэмію—кніжкі.

Кезіку. Газэту Вам пасылаем. Пісьмо Вашае перадалі ў Б.І.Г. і К. Пішыце да нас аб жыцьці Вашай ваколіцы і распаўсюджывайце нашу газэту.

Грошы за газэту атрымалі: ад адваката Сьвірыда 6 зл., Адама Сінкевіча 5 зл. Язэпа Гапановіча 4 зл., Балеслава Баркоўскага 4 зл. Дзякуем, газэту пасылаем і вышлем Вам усім прэмію — кніжкі.

Ад Пабудзея Сымона 2 зл. і Уладзіміра Хіневіча 1 зл. атрымалі. Дзякуем, газэту пасылаем.

Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец Янка Шутовіч